**Заданні**

**раённай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры**

**ў 2014/2015 навучальным годзе**

5. **клас**

**Заданне 1. Запішыце словы ў алфавітным парадку.**

Пабагацець, паваліцца, паабіваць, павук, пааддзіраць, павымятаць, палавік, падагрэты, панскі, паганка.

**Заданне 2. Колькі разоў сустракаюцца гукі ў сказах?**

[й]: Людзі і сякерай голяцца, а мы і брытвай не ўмеем.

[с]: Не скачы на высокія горы, бо на нізкія сядзеш.

[т]: Не адцягнеш, як ката ад сала.

**Заданне 3. Устаўце прапушчаныя літары ў наступных словах.**

Др…жаць, камп…ют…р, поч…рк, в…негрэт, ж…тон, м…ладычны, др…васек, ч…рствы, м…тровы, бр…зент, м…лагучны, гл…таць, ябл…чны.

**Заданне 4. Вызначце фразеалагічныя адпаведнікі ў рускай і беларускай мовах.**

| | |
|---|---|
| 1. Як пугай па вадзе | а) как угорелый; |
| 2. Вадзіць дзяды | б) бабушкины сказки; |
| 3. Як муха на смале | в) клевать носом; |
| 4. Без нічога ніякага | г) как об стенку горох; |
| 5. Плёткі старой цёткі | д) ни с того ни с сего. |

**Заданне 5. Запішыце шэсць назоўнікаў мужчынскага роду, якія абазначаюць назвы дрэў, што растуць у Беларусі.**

**Заданне 6. Да слоў першай групы падбярыце адпаведныя словы з другой групы. Запішыце атрыманыя пары слоў.**

А) Горад, рака, возера, вобласць, раён, паэт, кампазітар, мастак, касманаўт, першадрукар, аповесць.

Б) Мазырскі, Свіцязь, Максім Танк, “Насцечка”, Пётр Клімук, Слуцк, Францыск Скарына, Міхаіл Савіцкі, Ігар Лучанок, Прыпяць, Гомельская.

**Заданне 7. Выпішыце словазлучэнні, вызначце ў іх галоўныя і залежныя словы.**

Я іду, чытаць казку, шэсцьсот восем, на працягу года, зялёны луг, вучыцца добра, не буду маўчаць, апалае лісце, спаць у доме, гаварыць напяваючы.

**Заданне 8. Запішыце сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.**

А) На зямлі на кустах на стагах усюды ляжаў снег.

Б) Повар старанна выбіраў гародніну радыску цыбулю моркву.

В) Пачакайце сябры мяне хвілінку.

Г) Свяціла сонца і лагодна павяваў ветрык.

Д) Шануйце родную мову пісаў Якуб Колас.

**Заданне 9. Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з’яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату.**

А) Не зведаўшы броду, не … .

Б) Сам не гам, і ... .

В) Новых сяброў нажывай, але … .

Г) Слова, як птушка: … .

Д) Ладзь калёсы зімой, а … .

**Заданне 10. У беларускага народа багатая духоўная спадчына. Запішыце вядомыя вам жанры фальклору (вуснай народнай творчасці).**

**Адказы**

**5 клас**

**1. Запішыце словы ў алфавітным парадку.**

Паабіваць, пааддзіраць, пабагацець, паваліцца, павук, павымятаць, паганка, падагрэты, палавік, панскі.

(**10 б.** – 1 бал за кожнае правільна размешчанае слова)

**2. Колькі разоў сустракаюцца гукі ў сказах?**

[й] – 4: людзі [й] сякера[й], а мы [й] не ўме[й]эм;

[с] – 3: [с]качы, вы[с]окія, ні[с]кія;

[т] – 2: ка[т]а, а[т] сала. (**3 б.** – 1 бал за кожны правільны адказ)

**3. Устаўце прапушчаныя літары ў наступных словах.**

Дрыжаць, камп'ютар, почырк, вінегрэт, жэтон, меладычны, дрывасек, чэрствы, метровы, брызент, мілагучны, глытаць, яблычны.

(**14 б.** – 1 бал за кожную правільную літару)

**4. Вызначце фразеалагічныя адпаведнікі ў рускай і беларускай мовах.**

1 г, 2 в, 3 а, 4 д, 5 б (**5 б.** – 1 бал за кожны правільны адказ)

**5. Запішыце шэсць назоўнікаў мужчынскага роду, якія абазначаюць назвы дрэў, што растуць у Беларусі.**

Дуб, клён, граб, ясень, вяз, каштан

(**6 б.** – 1 бал за кожнае слова)

**6. Да слоў першай групы падбярыце адпаведныя словы з другой групы. Запішыце атрыманыя пары слоў.**

А) Горад Слуцк, рака Прыпяць, возера Свіцязь, Гомельская вобласць, Мазырскі раён, паэт Максім Танк, кампазітар Ігар Лучанок, мастак Міхаіл Савіцкі, касманаўт Пётр Клімук, першадрукар Францыск Скарына, аповесць“Насцечка”.

(**11 б.** – 1 бал за кожны правільны адказ)

**7. Выпішыце словазлучэнні, вызначце ў іх галоўныя і залежныя словы.**

Чытаць казку, зялёны луг, вучыцца добра, апалае лісце, спаць у доме, гаварыць напяваючы.

(**6 б.** – 1 бал за кожны правільны адказ)

**8. Запішыце сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.**

А) На зямлі, на кустах, на стагах – усюды ляжаў снег.

Б) Повар старанна выбіраў гародніну: радыску, цыбулю, моркву.

В) Пачакайце, сябры, мяне хвілінку.

Г) Свяціла сонца, і лагодна павяваў ветрык.

Д) “Шануйце родную мову”, – пісаў Якуб Колас.

(**12 б.** – 1 бал за кожны правільна пастаўлены знак прыпынку)

**9. Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з’яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату.**

А) Не зведаўшы броду, не лезь у воду.

Б) Сам не гам, і другому не дам.

В) Новых сяброў нажывай, але старых не забывай.

Г) Слова, як птушка: вылецiць – не зловiш.

Д) Ладзь калёсы зімой, а сані летам.

(**5 б.** – 1 бал за кожны правільны адказ)

**10. У беларускага народа багатая духоўная спадчына. Запішыце вядомыя вам жанры фальклору (вуснай народнай творчасці).**

Міфы, легенды, паданні, казкі, песні, загадкі, прыказкі, прыкметы, павер'і.

(**9 б.** – 1 бал за кожны правільны адказ)

**Максімальная колькасць балаў – 81**